УДК 821.161.3-09

Ж. В. Косціна

Навук. кір. - І. В. Саверчанка, д-р філал. навук, прафесар

ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ПАЭЗІІ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА Ў КАНТЭКСЦЕ РАМАНТЫЗМУ

У артыкуле разглядаецца паэтычная творчасць Вінцэся Каратынскага з мэтай выяўлення эстэтычнага ідэалу ў сувязі з праблемай станаўлення і развіцця рамантызму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Аналіз твораў «Першы дзень вясны», «Казка маѐй нянькі», «Каралеўскі плашч» з пазіцый агульнафілалагічнай цэласнасці даказвае, што аксіялагічныя арыенціры эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры нараджаліся ў першай палове XIX стагоддзя. Крыніцай прыгожага была вусная народная творчасць, бо толькі яна на думку Каратынскагарамантыка змагла захаваць хрысціянскае разуменне сутнасці прыроды, сацыяльных паводзін асобы.

Эстэтычны ідэал выступае асноўнай катэгорыяй мастацкай літаратуры. Пытанне эстэтычнага ідэалу турбуе даследчыкаў як у тэарэтычным, так і ў метадалагічным плане (Г. М. Паспелаў, Ю. Б. Бораў, В. Я. Хализеў). У апошнім выпадку неабходна падкрэсліць, што ѐн уяўляе сабой вызначаны прынцып даследавання мастацкіх твораў, які скіраваны на пазнанне індывідуальнанепаўторнага і гістарычна-тыпалагічнага ў творчым вопыце пісьменніка. Яго сфера - літаратурныя феномены, якія з'явіліся дзякуючы намаганням творчай асобы. Першая палова XIX стагоддзя можа быць названа перыядам «станаўлення беларускай мастацкай традыцыі» (А. С. Яскевіч), што абумовіла далейшае фарміраванне ідэйнага зместу нацыянальнай літаратуры ажно да першай трэці XX стагоддзя (канцэпцыя адзінай плыні, сфармуляваная І. Э. Багдановіч). Неабходнасць разгляду эстэтычнага ідэалу паэзіі Вінцэся Каратынскага тлумачыцца тым, што духоўныя каштоўнасці, якія выступаюць, побач з гармоніяй, асноўнай катэгорыяй эстэтычнага ідэалу могуць па-рознаму тлумачыцца ў залежнасці ад магістральных рухаў і тэндэнцый развіцця грамадства, пад знакам якіх праходзіць тая або іншая эпоха. Литературоведение 74 Рамантызм (ад французскага romantism) - гэта мастацкі метад, які сфарміраваўся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. у эпоху гістарычнага пералому, пераходу ад феадалізму да развіцця капіталістычных адносін. Пісьменнікі-рамантыкі ў процілегласць рэальнасці, якую яны не прымалі, ствараюць іншы, незвычайны свет, у якім жывуць і дзейнічаюць выключныя па характары і паводзінах героі, людзі моцныя, смелыя, схільныя да глыбокіх перажыванняў, пачуццяў. У імя выяўлення свайго ідэалу пісьменнік дазваляе сабе адысці ад праўдападобнасці і праўды гістарычных фактаў. Але ў той жа час менавіта рамантызм увѐў у літаратуру прынцып гістарызму, адышоў ад абстрактнасці ў паказе жыцця. Імкненне да гістарызму, да канкрэтных дэталей у паказе жыцця выявілася ў стварэнні «мясцовага каларыту». Важная асаблівасць рамантыкаў - «шырокае выкарыстанне вуснай паэзіі свайго і іншых народаў» [1, с. 239]. Як пацверджанне гэтаму, словы А. Яскевіча: «Нованацыянальныя літаратуры, у прыватнасці беларуская, для выбаўлення з палону, з аднаго боку, польскага, а з другога, рускага, полілінгвізму і адраджэння сваѐй самабытнай мастацкай традыцыі вымушаны былі развівацца ў самым непасрэдным узаемадзеянні з вуснай народнай творчасцю, з фенаменальным родавым сінкрэтызмам, засвойваючы праз гэты першасны вопыт народнай эстэтыкі нацыянальную ментальнасць, паэтычныя сюжэты і стылістыку, напачатку і самі фальклорныя спосабы і сродкі мадэлявання рэчаіснасці» [2, с. 42]. Сфера рамантызму - «таемная глеба душы і сэрца, адкуль падымаюцца ўсе неабходныя імкненні да лепшага і ўзвышанага, імкненне знайсці сябе ў ідэалах, якія творацца фантазіяй» [1, с. 368]. Паэты-рамантыкі ў сваѐй творчасці часта звярталіся да народнай творчасці, да фальклору. Гэты зварот праяўляўся і ў жанравым выражэнні, і ў выбары вобразаў і матываў. Яскравым пацвярджэннем гэтага з'яўляецца верш В. Каратынскага «Першы дзень вясны». У вершы паказаны адносіны да вясновага ранку і да жыцця дзвюх асоб: паэта і аратага. У першых дзвюх строфах В. Каратынскі адступае ад трывалай на той час традыцыі паказу вясны ў жыцці селяніна як пары нястач, галаду і смутку. Вясна ўспрымаецца ім як святочная,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыццесцвярджальная з‘ява, якая «кожнага ўсцешвае марай новай», у той час, калі стан, пачуцці лірычнага героя - гэта кантраст святочнаму веснавому малюнку. Радкі верша, у якіх падаецца апісанне прыроды, прасякнуты вобразамі-сімваламі рамантычнай паэзіі: ранак, сонца, жаваранак і яго песня, вясна. Найбольш характэрны з іх - вобраз жаваранка, які часта 75 сустракаецца ў беларускіх народных песнях-вяснянках і якога беларусы лічаць вешчуном вясны, «божай» птушкай. Паводле этыялагічнага міфа, «гэтую птушку стварыў Бог, падкінуўшы ў неба камячок зямлі, з чаго зрабілася маленькая шэрая птушачка з прыемным спевам. Жаваранак непрыкметна падняўшыся ў неба, заўсёды імкліва каменем падае на зямлю, нібы пацвярджаючы сваѐ паходжанне. Спеў яго расшыфроўваецца як пахвальба» [3 с. 485]. Словы жаваранка дапамагаюць творцы па-іншаму паглядзець на свет - паглядзець на ўсѐ праз прызму святой Надзеі, паверыць, што «сэрцу верне сілу веры пачуццѐ святое». Герой ацэньвае сваѐ прызначэнне і разумее, што ѐн сам уладар свайго жыцця і з Божай дапамогаю яму вызначаны лѐс паэта: «Божай воляй тут мне доля // Так наканавана: // Сам парушыць гусляў мушу // Песняю нязнанай» [4, с. 18]. Песня - гэта жанр сінкрэтычны, які спалучае ў сабе і слова і музыку, гэта найбольш гарманічны жанр мастацтва, які акумулюе ў сабе духоўнае - гэта і хараство, якое ўзвышае душу чалавека, нявыказна велічнае, і жыццѐвыя «парады», якія дадзены вышэйшай сілай: «Будзе песня сонцам веснім - // Сілай веснавання, // З небам звонкім і старонкай // Злучыцца пяянне» [4, с. 16]. Верш Каратынскага прымушае паверыць у існаванне ўсеахопнай гармоніі паэта з прыродай, Богам і мастацтвам як сутнасці творчасці і жыцця. У творчасці В. Каратынскага рысы рамантызму мы знаходзім у першую чаргу ў вершаваных фальклорных апрацоўках. Сам В. Каратынскі на гэты конт пісаў: «Казкі і песні народа - гэта вобраз яго сэрца і фантазіі, паданні і прымаўкі - гэта яго гісторыя і філасофія. Не даследаваўшы і не прасякнуўшыся імі, не варта выказвацца пра яго» [4, с. 150]. «Казка маѐй нянькі» Вінцэся Каратынскага - гэта апрацаваная чарадзейная казка, якая належыць да групы чарадзейных казак («Папялушка», «Свіны чахол», «Дзівосная карова»), асноўныя персанажы якіх падзяляюцца на станоўчыя і адмоўныя: на адным полюсе мачыха і яе дачка, на другім - бедная, забітая падчарка. Разам з тым у казках важную ролю адыгрываюць цудоўныя памочнікі, чарадзейныя прадметы, метамарфозы, якія адбываюцца з героямі. Вельмі выразна малююць казкі становішча падчаркі ў сям‘і. Мачыха і ў будні, і ў святы загружае яе рознай работай, нават калі выпраўляе пасвіць жывѐлу, дае ѐй «мех кудзелі і пук верацѐн, каб яна ўсѐ спрала, выткала, выбеліла, у свойчыкі пакачала дай дахаты ўвечары прынесла»[4, с. 365]. Сабраўшыся на Каляды з дачкой у царкву, мачыха дае сіраціне «мерку маку, змяшаўшы з попелам, каб яна яго Литературоведение 76 чыста перабрала» [4, с. 359]. Усе гэтыя заданні разлічаны на тое, што падчарка іх не зможа выканаць і будзе прычына яе пакараць, але дзяўчынцы дапамагаюць цудоўныя памочнікі. У большасці выпадкаў у ролі цудоўных памочнікаў выступаюць кароўка ці бычок-траццячок, якіх пасе падчарка. Яны або самі нейкім чынам выконваюць усю работу, якую атрымала ад мачыхі падчарка, або клічуць на дапамогу «марскіх дзевак», як аб гэтым гаворыцца ў «Казцы пра сіротку Даротку» (Чарадзейныя казкі, I, № 50). Іх заступніцтва і дапамога не абмяжоўваюцца выкананнем працы, якую злая кабета прымушае рабіць падчарку. Нават калі мачыха дазналася, хто дапамагае падчарцы, і загадала зарэзаць кароўку, сіротка знаходзіць у яе чэраве чарадзейнае зярнятка, з якога вырастае яблынька з залатымі яблычкамі, і ўжо яблынька выступае тут як чарадзейная расліна, як заступніца, з дапамогай якой падчарка бярэ шлюб з царэвічам, каралевічам ці панічом. В. Каратынскі свядома выбірае вершаваную эпічную форму для інтэрпрэтацыі народнага казачнага сюжэту пра злую мачыху і падчарку. Праз такі прыѐм эстэтызуецца пагляд «братоў у капоце і сярмязе» (Сыракомля), а паэт імкнецца яго прыблізіць да чытацкай аўдыторыі - адукаванай шляхты. У сваім вершы Каратынскі захаваў асаблівасці архітэктонікі народнай казкі - традыцыйны пачатак і канец: «Далѐка ці блізка, птушынка, не знаем, // Жыў-быў сабе колісь над рэчкай Дунаем // Адзін чалавек, неблагі чалавечак» [4, с. 37] і «І я там была і піла тыя віны, // Была я прыгожая й з гэтай прычыны, // Тады з каралѐм тым кружылася шыбка, // Аж скача душа...» [4, с. 41]. Той факт, што падзеі ў аўтарскім творы адбываюцца каля ракі Дунай, якая лічылася ў славян краем свету, сведчыць аб міфалагічным часе, найчасцей

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ідэалізаваным народнымі апавядальнікамі. У яго казцы дзейнічаюць тыя ж героі, што і ў народнай; аўтар паўтарае сюжэт, які, як нам сцвярджае назва верша, ѐн пачуў ад сваѐй нянькі, якой у самога Каратынскага не было, затое былі нянькі ў шляхты. Паэт маляўніча апісвае сіротку, хаця імені яе не называе: «Дзяўчына - малюнак, твар мілы, стан тонкі, Была працавітай - ні дня ѐй, ні ночы» [4, с. 37]. Відаць, паэт імкнецца стварыць абагулены вобраз дзяўчыны-сіроткі. Увагу прыцягвае той эпізод казкі Каратынскага, які мае выразнае адрозненне ад народнай. У апошняй дзяўчына ў канцы выходзіць замуж за прыгожага каралевіча. Гераіня Каратынскага ж на прапанову пана стаць каралеўнай адказвае: «Пакінь ты, о пане, мяне, басаножку // Дазволь мне падацца ў любую 77 дарожку, // Не каралевай быць, паняй вяльможнай, // Кахала я раз, дык другі раз ці ж можна?» [4, с. 37]. І казку Каратынскі заканчвае вяселлем, на якім кароль-сват і гуляе разам з іншымі. Паэт свядома паказвае шчаслівы, як і прынята ў казках, канец. Але дзяўчына сама ажыццяўляе выбар. І яе выбар зроблены на карысць простага, але любага хлопца, бо яна разумее, што ні паненкай, ні, тым больш, каралеўнай ѐй не стаць. Кароль прымае яе рашэнне, не навязваючы сваю волю. Аўтарская імправізацыя фінала - гэта жаданне раскрыць ідэю шчаслівага шлюбу, калі маладыя жылі аднолькавымі інтарэсамі, адмаўляючы празмерную раскошу, а зараблялі сваѐ шчасце ўласным мазалѐм. Пра шырокі зварот Каратынскага да апрацоўкі паданняў сведчыць і твор «Каралеўскі плашч», жанр якога акрэслены самім паэтам як гістарычнае паданне. Такое вызначэнне дазваляе меркаваць пра рэальную аснову расказанай паэтам гісторыі, тым больш што ў вершы ўпамінаюцца імѐны гістарычных асоб - Альгердаў сын Ягайла, вялікі князь Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) (1377-1392); Вітаўта, вялікага князя ВКЛ (1350-1430); Скіргайла, князя ВКЛ (1354-1396); Ядзвігі - польскай каралеўны. Апісанню апошняй адведзена асаблівае месца. Сам твор умоўна можна падзяліць на 3 часткі. У першай частцы аўтар выкарыстоўвае прыѐм рэмінісцэнцыі - аповед старога дапытлівага чужынца вяртае нас у часы праўлення Ягайлы, часы жыцця Ядзвігі - «добрай уладаркі..., якая праз шлюб звязала краі два ў адзіны» [4, с. 44]. З гісторыі вядома, што яна была адной з чатырох жонак Ягайлы, якая, на жаль, не мела дзяцей. У вершы каралеўна паказана сціплай, разумнай, прыгожай жанчынай, якая ўяўляе прыклад духоўнасці свайго часу. Менавіта духоўнасць гэтай незвычайнай жанчыны дапамаглі ѐй здзейсніць сапраўдны цуд - ажывіць хлопчыка, які зваліўся ў Віслу. І каралеўскі плашч, якім яна накрыла хлопчыка, становіцца сапраўднай святыняй, рэліквіяй, абярэгам, у сілу якога людзі не перастаюць верыць: «Ды думка - вечны дух - і ў паўнаводдзе, // Як той святы - сухой нагой ходзіць» [4, с. 44]. Станаўленне мастацкай традыцыі новай беларускай літаратуры мае для айчыннага прыгожага пісьменства найважнейшае значэнне. Менавіта ў XIX стагоддзі дзякуючы Вінцэсю Каратынскаму нараджаліся аксіялагічныя арыенціры эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры. Крыніцай прыгожага была вусная народная творчасць, бо толькі яна, на думку паэта, змагла захаваць хрысціянскае разуменне сутнасці прыроды, сацыяльных паводзін асобы. Литературоведение 78

Спіс літаратуры 1 Краткая литературная энциклопедия: в 9 т. / Под общ. ред. А. А. Суркова. Т.6. - М.: Сов. энциклопедия, 1972. - 1039 с. 2 Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні : матэрыялы Рэспубл. навук. канф. (Мінск, 29 вер. 2006 г.) / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; рэдкал.: У. Мархель (гал. рэд.) [і інш.]. - Мінск : Беларус. навука, 2006. – 167 с. 3 Беларускі фальклор: хрэстаматыя: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей вну / склад.: К. П. Кабашнікаў [і інш.]. - 4-е выд., перапрац. - Мінск: Вышэйш. шк., 1996. - 856 с. 4 Каратынскі, В. Творы / В. Каратынскі. - Мінск: Маст. літ., 2007. – 309 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ